21.12.2023 у дзяржаўнай установе адукацыі «Гімназія №5 імя У.С.Караткевіча г. Гродна» адбылося мерапрыемства праекта “ШАГ” па тэме “Родина моя Беларусь в лицах. Хранители прекрасного (о деятелях культуры и искусства)” для вучняў 8-11 класаў. Вучні гімназіі актуалізавалі веды пра культуру і мастацтва Рэспублікі Беларусь з дапамогай інтэрактыўнай віктарыны “Мы даведваемся”.

Ганаровым госцем мерапрыемства стала Кебіч Людміла Антонаўна, паэтэса, празаік, старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, Ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі, Член Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы, Член міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў, двойчы лаўрэат прэміі А.І.Дубко Гродзенскага аблвыканкама “За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва”, лаўрэат абласной прэміі “Чалавек года Гродзеншчыны” ў сацыяльна-палітычнай сферы. Узнагароджана медалём Саюза пісьменнікаў Беларусі “За вялікі ўклад у літаратуру”. Адбыўся цікавы дыялог з Людмілай Антонаўнай, пад час якога вучні зразумелі, што добрасумленная праца, клопат пра сваю сям’ю, актыўная жыццевая пазіцыя, любоў да сваёй працы, Радзімы, народа – асноўныя якасці, якія характарызуюць беларусаў.



# Кебіч Людміла Антонаўна

Паэтэса, празаік, старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, Ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі, Член Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы, Член міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў, двойчы лаўрэат прэміі А.І.Дубко Гродзенскага аблвыканкама “За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва”, лаўрэат абласной прэміі “Чалавек года Гродзеншчыны” ў сацыяльна-палітычнай сферы. Узнагароджана медалём Саюза пісьменнікаў Беларусі “За вялікі ўклад у літаратуру”.

*Праменчык сонечны заззяў,*
*Жыццё ў вясновым гкдзе…*
*Вясну ніхто не адмяняў,*
*А знчыцць , жыць мы будзем.*

*Л.А.Кебіч*











З першага класа Людміла Антонаўна пачала праяўляц свае творчыя здольнасці. Менавіта тады яна напісала першы верш і адразу зразумела, што творчасць будзе суправаджаць яе на працягу ўсяго жыцця.




Людміла Антонаўна ўпэўнена, што вершы і проза - гэта важная форма выказвання сваіх думак і ідэй, а таксама сродак надаць сэнс і глыбіню сваім эмоцыям. "Кожны чалавек можа пакінуць след у гісторыі і культуры сваёй краіны праз творчасць", - упэўнена паэтэса.

ШАГ
Школа Активного Гражданина

У сваіх творах Людміла Антонаўна імкнецца перадаць культурную спадчыну Беларусі. Яны адлюстроўваюць розныя аспекты гісторыі, традыцый і ўнікальнасці беларускага народа. Людміла Антонаўна адчувае глыбокі гонар і пачуццё адказнасці за захаванне і пераемнасць культурных каштоўнасцей сваёй краіны. Яе творы становяцца люстэркам беларускай культуры, натхняюць і захапляюць маладое пакаленне.







ГУО «Гимназия №5 им. В.С.Короткевича г. Гродно»

ШАГ
Школа Активного Гражданина

# Мы ганарымся такімі землякамі, якія жывуць побач з намі!



ГУО «ГИМНАЗИЯ №5 им. В.С.Короткевича г. Гродно»